№ 5. Нядзелак, 10 кастрычніка (27 сенцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Спрэчка **Літвы і Польшчы,** посьле таго, як Літоўскі Сойм адкінуў другі праект Гіманса, ізноў зацягнулася. Ліцьвіны цяпер дабіваюцца, каб праект быў папраўлены ў пунктах, нявыгодных незалежнаму істнаваньню Літвы. Можна спадзявацца, што Ліга Народаў, прызнаўшы Вільню Літве, а ня Польшчы, прыхінецца і да выстаўленых ліцьвінамі паправак к праекту Гіманса. У зьвязку з гэтым, польскія палітыкі **Сярэдняе Літвы** ізноў ухапіліся за права самаазначэньня. Болей-меней паступовыя з іх хочуць склісканьня Сойму ў Вільні. Тымчасам, эндэкі не бяз прычыны баяцца, што навет Сойм, сабраны пры цяперашніх палітычна-грамадзкіх варунках жыцьця ў Сярэдняй Літве, акажацца не памысным для іх справы, і яны выступаюць супроць яго склісканьня. Яны хочуць падмяніць Сойм сабраньнем польскіх прадстаўнікоў Віленскай Мястовай Рады (бо жыдоўскія раз ужо не пайшлі), і прадстаўнікоў павятовых і гмінных (валасных) рад, у якіх цяпер сядзяць найболей людзі для эндэкаў пеўныя. Хто пераможа, сказаць трудна ды й гадаць няма асаблівае патрэбы... Шмат тут будзе залежаць ад голасу бяларусаў і жыдоў, як гэта было пры першай думцы склікаць Сойм, калі тыя й тыя адмовіліся браць удзел у выбарах. Покуль што і жыды і беларусы маўчаць, прыслухаючы да таго, што дзеецца ў гэтай справе на полі міжнароднай сусьветнай палітыкі.

Астатні час азначыўся рознымі вялікімі прыкрасьцямі для віленскіх ліцьвіноў і іхных установ у Вільні.

Унутранае палітычнае становішча **Нямеччыны** цяпер палепшала. Змаганьне партый троху сьцішылася. Узмацняецца прыхільнасьць немцаў да Савецкае Расеі. Ліга Народаў аддаець Нямеччыне выгодную часьць **Горнай Сьлезіі.**

Адносіны **Англіі** з незалежнікамі (сінфейнерамі) **Ірляндыі** дужа пагоршалі. Ізноў можаць дайці да крывавага змаганьня. Паўстаньне ў **Індыі** супроць ангельцаў ніяк зусім ня сьціхае. Ангельскія ўплывы ў **Пэрсіі** нязвычайна падарваны Савецкай Расеяй. Безрабоцьце ў Англіі набрала гэткай небасьпекі, што занепакоіўся сам Лойд-Джорж і ўжо шукае рады.

Францыя, калі верыць бальшавіцкім паведамленьням, задумала вайну супроць Савецкае Расеі, але спачатку настраівае Румынію і ўсё болей уцягівае ў сваю палітыку Польшчу.

Румынія не перастае рыхтавацца к вайне з бальшавікамі. Паўстаньне ў **Бесарабіі** ўкраінскіх сялян ёй, мабыць, удалося задушыць, хоць пеўных вестак дагэтуль няма.

Польшча ніяк ня можа дайці ладу з **Савецкай Расеяй.** Адносіны ў іх цяпер самыя дрэнныя. Польскі пасол вярнуўся з Масквы. А як пішуць некаторыя газэты, і Карахан „складае свае манаткі“ ў Варшаве. Бальшавікі так—такі яшчэ і ня плоцяцьПольшчы золата паводле дагавору ў Рызе. У Маскве яны заарыштавалі былі навет афіцера з польскага пасольства. Ці палепшацца адносіны ў недалёкай будучыні, трудна згадаць, а злашча калі прыслухацца да ваяўнічых прамоў Троцкага, які проста пагражае новаю вайною.

Зьмест Рыжскага дагавору ужо пададзены ў Лігу Народаў. Вельмі важна і цікаўна, як яна паглядзіць на гэты дагавор.

Бальшавікам, наўзьдзіў, ізноў удалося забраць **Уладзівасток,** выгнаўшы адтуль „паў-белых“ расейцаў, і такім чынам выйці к акеану. Японцы, агледаючысь на іншыя вялікія гаспадарствы і лучаючы зручнейшы час, цяпер не мяшаюцца.

Угоршчына абвесьціла была „незалежнасьць“ спрэчных з **Аўстрыяй** узьмежкаў, але, відаць, спужалася новых пагроз Антанты і згодзілася аканчальна адмовіцца ад іх.

На **Блізкім Усходзе** завіруха ня мае́ць канца. **Туркі,** пабіўшы **Грэкаў,** хочуць размаўляць толькі з Антантаю і вымагаюць, каб Грэцыя ачысьціла ўсе турэцкія даваенныя землі. Грэкі, аднак, яшчэ ня хочуць прызнаць сябе пераможанымі, хоцьжа ўнутры гэтай старонкі робіцца што дня горш, і магчымы пераварот.

Пагранічныя спатычкі **Сэрбіі з Албаніяй** пагражаюць перакінуцца ў запраўдную вайну. Сэрбія хоча дабыць сабе Скутары. На паўдзённую Албанію пасыкаецца Грэцыя.

У **Марока** Абдуль-Кэрым абвесьціў „сьвятую“ вайну. Армія **Гішпаніі** ізноў пабіта паўстаўшымі маўрамі.

Што датычна палітычных спраў **Беларусі** за граніцаю, дык асаблівых зьмен няма, але посьле зьезду ў Празе беларускі голас ў Эўропе зрабіўся значна дужэйшым.

За сачывічную поліуку.

Гістарычная доля кідае наш край з яго гаротным беларускім народам у абымкі „родных братоў“—то палякоў, то расейцаў. Кожны з гэтых братоў, як толькі возьме ў свае лапы, стараецца пераманіць на свой бок, а пасьля і спаланізаваць ці зрусіфікаваць перш інтэлігэнцыю, а затым і самы народ. Але тут трэба заўважыць, што ў даным выпадку пад інтэлігэнцыяй мы разумеем ня тую інтэлігэнцыю, якая паходзіць з нашага народу, якая мае цесную, арганічную, духоўную сувязь з сваім народам, працуе на карысьць гэтага народу перш за ўсё... Тут мова йдзе аб той інтэлігэнцыі, якую вядзе з сабою ўлада з Расеі, або з Польшчы і якую ўлада сумее прыгатаваць водлуг свайго капыла з тутэйшай людпасьці, адарваўшы яе ад народу. Гэта чыстай пробы чыноўнікі мундзіра, ардэноў і дваццатага чысла. Гэта арудзьдзе прышлай улады, зраднікі народу. Для гэтых паноў духоўныя патрэбы мясцовай людпасьці, імкненьні душы народу невядомы. Ня зьвязаныя духоўна з народам, яны сядзяць на яго плячох, ня гледзячы на розныя зьмены; зараз-жа новая ўлада за сачывічую поліўку перацягвае іх да сябе, і яны пачынаюць гнуць душу народу ў той бок, адкуль прышла ўлада. Але душа народу моцная, упругая, ня так лёгка паддаецца ўплывам. Яе не магла зламаць ні польская, ні расейская ўлада ў працягу некалькіх вякоў.

Дык вось, панове ўчарайшыя расейскія чыноўнікі, а сёньня—польскія, схамянецеся, апомніцеся, што вы робіце з душою народу! Ці вы разумееце яго трагэдыю? Прэч вашы рукі ад чыстага сумленьня народу, які хоча быць самім сабою, выйці на свабодны шчасьлівы шлях. Асабліва да вас зварочваемся, паны дырэктары былых сярэдніх школаў, і педагагічным радам іх, якім былі даручаны дзіцячыя душы нашага гаротнага народу і якія да гэтага часу стаяць на чале школаў. Калі ў вас, як культурных працаўнікоў, захавалася хоць адна іскра пашаны да культа душы, не калечце дзяцей, навязваючы ім за танную поліўку чужую школу. Успомніце заветы вялікіх педагогаў, якія цьвярдзілі, што ўзгадаваньне павінна быць нацыянальным, навучаньне павінна вясьціся ў сваей роднай мове. У праціўным выпадку вы калечыце людзёў, гадуеце з іх ворагаў чалавецтва, якія забыўшы і зьневажаючы сваю родную мову, ня будуць шанаваць мовы другіх народаў, а разам з гэтым і іх правоў.

Ідэю чалавецтва і гуманнасьці стаўце вышэй за сачывічную поліўку і асабістыя інтарэсы. Не адрывайце дзяцей ад іх нацыі, ня крыўдзіце самага пакутнага народу, які сваею мазалістаю рукою вас узгадаваў і корміць. Прыслухайцеся к яго духоўным патрэбам, к яго імкненьням, памажыце яму выйці з цемры духоўнай, з горкай нядолі.

Ш.

Новае—старое.

У царскай Расеі, як даводзілі нам падручнікі географіі, жыло сто адзіннаццаць народаў. Разумеецца, народы гэтыя не карысталіся ніякімі правамі дбаць аб сабе і жыць так, як самі хацелі-б. Прыходзілася жыць па прыказу з Пецярбургу, які не прызнаваў ніякіх нацыянальных пытаньняў і ня лічыўся ні з чым. На Каўказе, ў Туркестане, ў Польшчы, ў Прыамурскім краі праводзілася адна і тая самая палітыка, што і ў Маскоўскай губэрні. Тэрыторыі, заселеныя паасобнымі народамі, падзелены былі на губэрніі так, што ў аднэй губэрніі аказываліся часткі двох, або трох народаў. Усё гэта рабілася зусім сьвядома, каб разьбіць „безсмысленныя мечтанія“ аб якіх-бы та ні было нацыянальных пытаньнях, каб паасобныя нацыянальнасьці былі пастаўлены у палажэньне, найменш спагадаючае еднасьці і сарганізованнасьці нацыі. Так было ў царскай Расеі.

А што мы бачым цяпер у Польшчы? Якая палітыка ў адносінах да беларусаў і ўкраінцаў праводзіцца тым ці іншым прадстаўніком польскіх урадуючых сфэраў?

А вось якая.

У гмінных праўленьнях часта-густа садзяцца асобы, „выбраныя“ толькі на паперы. Насяленьне, беларускае ці ўкраінскае, з такім-жа правам можа лічыць многіх з іх сваімі прадстаўнікамі, як кітайцаў або нэграў. Беларускія школы, можна сказаць, ня істнуюць. Асобы, не спаўняючыя канстытуцыі сваей Рэспублікі, ўсялякімі спасабамі накідаюць беднаму нашаму народу польскія школы, якіх народ ня хоча, бо ня ведае польскай мовы, бо ня хоча і ня можа адрачыся ад свайго. Найчасьцей на вышэйшых і ніжэйшых пасадах сядзяць каранныя палякі з Пазнані, або з Галіцыі, а ў лепшым прыпадку тутэйшыя палякі. Аб беларусах рэдка калі прходзіцца чуць. Адносіны да беларусаў з боку многіх начальнікаў і з боку пеўнай часьці грамадзянства зусім нядбайныя. Нас уважаюць то за маскалёў, то за бальшавікоў, то наагул за людзей другога гатунку.

Беларусь, часткаю папаўшая пад Польшчу, падзелена на правінцыі—ваяводзтвы, і нічога ня відаць, каб у гэных ваяводзтвах праводзілася палітыка па прынцыпу, абвешчанаму у першыя дні польскага панаваньня ў нашым краі: „роўныя з роўнымі і вольныя з вольнымі“.

Што ёсьць беларускага у польскай палітыцы па „крэсах“, дзе скрозь жыве беларуская народная гушча? У урадовых установах, у гмінных і павятовых праўленьнях — усё толькі папольску. Здаецца, неўзабаве ня будзе ніводнай беларускай школы ува ўсёй Гарадзеншчыне і польскіх Віленшчыне і Меншчыне. Толькі ў Сярэдный Літве трымаюцца яшчэ дзесяткі два пачаткавых беларускіх школ, ды й то з няпеўнай будучыняй.

Бязрадасны абраз беларускага жыцьця... Дзе падзеліся нашыя вольнасьці, якія нам абяцалі? Што сталася з прынцыпам роўнасьці ўсіх грамадзян Польскай Рэспублікі?

Іначай жывецца нацыянальным меншасьцям у іншых краёх. Ні ў Чэха-Славакіі, ні ў Юга-Славіі, ні ў аднэй з іншых новапаўстаўшых дзяржаў, дзе жывуць розныя народы, няма і рэчы аб культурна-нацыянальным уціску, а калі і ёсьць ён, то вельмі і вельмі слабы з боку нялічных крайніх шовіністаў. У маладой Незалежнай Літве, як бы ні злавалі на яе палякі за ўціск іх родзічаў, ёсьць аддзельныя міністэрствы беларускіх і жыдоўскіх спраў; ад польскага самі палякі адмовіліся. У Чэха-Славакіі ёсьць міністэрства славацкіх спраў. Факты гэтыя гавораць самі за сябе.

А што ёсьць для вялізарных тэрыторыяў Беларусі, адыйшоўшых да Польшчы па Рыжскаму міру?

Ня толькі беларускага міністэрства няма, але навет самага маленачкага чыноўніка па беларускім справам — і то няма. Адным словам— нічога няма.

Раўнуючы з іншымі дзяржавамі, у склад якіх увайшлі беларусы, Польшча асталася далёка ззаду. У ёй няма покуль што і прызнаку прызнаньня беларускага народу, як гэта ёсьць у другіх дзяржавах, гдзе пражываюць беларусы,—напрыклад у Літве, дзе ёсьць беларускі міністр, або у Савецкай Расеі, дзе ёсьць хоць Савецкая Беларусь, або навет у Латвіі, дзе не ставяць перашкод беларускай школе і адчынілі Сэкцыю Беларускай Культуры, або ў Сярэдняй Літве, дзе пры Дэпартамэнце Асьветы ёсьць два чыноўнікі Беларускага Аддзелу...

У Польшчы, так многа пацярпеўшай ад царскай Расеі, усё выходзіць у адносінах да нас так, як быццам Польшча ідзе сьледам за... царскай Расеяй.

-М. К.

Што чуваць у сьвеце?

Адстаўка Ашкіназі.

З Жэневы прыехаў у Варшаву прадстаўнік Польшчы ў Лізе Народаў прафэсар Ашкіназі. Ен падаецца ў адстаўку, а яго абавязкі ў Лізе Народаў мае поўніць п. Альшэўскі. („Sl. P.“).

Баварыя і Берлін.

Між Баварыяй і ўсенямецкім урадам ў Берліне дайшло да згоды. (Pat).

Горная Сьлезія.

Нямецкія газэты паведамляюць, што развязаньне справы Горнай Сьлезіі ў Лізе народаў наступіць гэтымі днямі.

Беларускі зьезд у Празе.

Львоўская украінская газэта „Вперед!“ паведамляе, што ў Празе ужо адбыўся зьезд беларускіх прадстаўнікоў усіх партый лікам 40 асоб. На зьезьдзе было абгаворана шмат палітычных спраў Зьезд меў характар выразна супроць-польскі.

Камуністычны загавор на сербскага караля.

Белградзкая „Правда“ паведамляе, што францускае паліцыя знайшла камуністычны загавор на жыцьцё караля Аляксандра. На ўсёй лініі чыгункі з Парыжа да Белграду загаворшчыкі мелі чакаць пераезду караля, каб забіць яго. („Рідный Край“).

Ізноў завіруха ў Ірляндыі.

З прычыны хаўтур аднэй з ахвяр астатніх спатычак дайшло да крывавых дэманстрацый ірляндзкага насяленьня. („Русь“).

Масква і Польшча.

Падцьвярджаецца чутка, што польскі пасол у Маскве Ціт Філіповіч ужо ня вернецца туды. Як прычыну, называюць „благі стан здароўя“.

Акупацыя Бургенлянду Антантаю.

З Рыма паведамляюць, што войскі Антанты часова акупуюць Бургенлянд.

Угоршчына зракаецца Бургенлянду.

Газэта „Рідный Край“ паведамляе, што падпісан акт, у якім Угоршчына зракаецца Бургенлянду на карысьць Аўстрыі.

Рыскі дагавор.

З Варшавы паведамляюць, што зьмест дагавору між Польшчаю і Саветамі ў Рызе ужо пераслан у Лігу Народаў.

Пракаповіча не растрэляюць,

Чычэрын паведаміў Нансена, даручнага Эўропы ў справе помачы галоднай Расеі, што няпраўда, быццам некамуністычных сяброў расейскага камітэту помачы галадуючым засудзілі на сьмерць (гл. № 3 „Бел Вед.“). Чычэрын кажа, што Савецкая Расея гатова і далей карыстаць з помачы Эўропы.

Уладзівасток у руках камуністаў.

З Рыгі паведамляюць, што 22 верасня савецкая армія заняла Уладзівасток. Японцы ў унутранае змаганьне расейцаў не мяшаюцца (Pat.).

Белавежская пушча.

Каб атрымаць заграничную валюту, польскі ўрад аддаець Белавежскую пушчу ў рукі француска-ангельскіх капіталістаў для эксплаатацыі. Польскі ўрад ужо дастаў на задатак 1 міліён фунтаў штэрлінгаў (Pat.).

Дэмабілізацыя ў Расеі.

Масква, 5. X. (Pat.). Абвешчана дэмабілізацыя салдатаў, якія радзіліся ў 1896 1897 гадох, а разам пераведзены ў армію працы салдаты 1898 г.

Справа Горнай Сьлезіі.

„Жэчпосполіта“ паведамляе, што камісія чатырох Рады Лігі Народаў, прыгатавала ўжо праект падзелу Горнай Сьлезіі між Польшчай і Нямеччынай. Нямецкія газэты пішуць, што праект гэты скончан ува ўсіх пунктах, і Рада Лігі Народаў прымець яго бяз зьмен.

Разгляд справы ў Лізе Народаў мае быць 11 лістапада.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе Чэскай.

Прага. З 21. з 24 IX. 1921 пачалі зьяжджацца ў Прагу прадстаўнікі беларускага народу з усіх канцоў Беларусі і з беларускіх калоніяў па-за-межамі.

Першымі прыехалі прадстаўнікі беларускай нацыянальнай меншасьці ў Латвіі і Літве.

25. IX. 21 а 5 гадзіне ў вечары ў Hotel Graff адбылася папярэдне-арганізацыйная прыватная гутарка сабраўшыхся дэлегатаў, якіх ўжо налічвалася 30 чалавек.

26. IX. 21 аб 11 гадзіне зранку ў Рэпрэзэнтацыйным Доме чэскага народу адбылося урачыстае адчыненьне Нарады.

Адчыніў Сход п. В. Захарка прамовай аб сучасным становішчы Беларусі, дзякуючы якому прадстаўнікі народу беларускага і яго Урад павінны зьбірацца за межамі Бацькаўшчыны.

Затым зьезд віталі прадстаўнікі розных народаў, з якіх асабліва сардэчныя прамовы і пажаданьні былі выказаны з боку украінцаў, жыдоў і вялікаросаў.

Ад украінцаў віталі украінскі с.—р. поэт Мікіта Шапавал, с.—д. Мартос і прадстаўнік украінскіх студэнтаў.

Ад расейцаў — эсэры Лазараў і Гурэвіч.

Апроч таго, выступалі з прывітаньнямі прадстаўнікі Кубанскай Рады, Казацтва, Грузіі і інш.

Пасля прывітаньняў ад гасьцей былі прачытаны прывітальныя тэлеграммы ад розных асобаў і арганізацыяў, і Нарада перайшла да слуханьня прывітаньняў ад дэлегатаў з мейсц (Латгалія, Літва, Гародзеншчына і Віленшчына) і ад Беларускай Дзяржаўнай Рады і Ураду.

У 12 г. 30 мінут Нарада абрала прэзыдыум, ў складзе: Старшыня — А. Цвікевіч, Тав. Стар. — В. Захарка, Сэкрэтар — Баран, і прыступіла да апрацоўкі парадку працы Канфэрэнцыі і падзелу на сэкцыі, якіх выдзелена было чатыры:

Палітычная,
Эканамічная,
Культурна - Прасьветная і
Гуманітарная.

Затым былі зацьверджаны высунутыя папярэдняй нарадай Мандатная і Гаспадарска — Сэкрэтарская Камісыі і выбрана дэлегацыя для прывітаньня Чэскага Ураду.

У 13 г. 5 мінутаў Першы Сход Канфэрэнцыі зачыніўся, і дэлегаты былі сфотографаваны ў залі.

Далейшая праца адбылася гэткім чынам: ад 9 гадзін да 12 гадзін што дня адбываўся пленарны адчынены Сход
„ 3 „ „ 6 „ — Палітычнае Сэкцыі,
„ 6 „ „ 8 „ — Эканамічнае,
ад 8 гадзін да 9 гадзін — Культурна-Асьвет.
„ 9 „ „ 10 „ — Гуманітарнае і
„ 10 „ „ 12, „ а часам і да 2 і 3 г. працаваў Прэзыдыум і Рэдакцыйн. К. а таксама Бюр. Друку

29. IX. 21 — Нарада была урачыста зачынена, але ўсе дэлегаты асталіся яшчэ ў Празе для працы ў розных камісыях, якія былі Нарадай выдзелены.

30. IX. 21 — Дэлегацыя Нарады была ў Міністра Міжнародных Спраў і Міністра Прэзыдэнта Чэхіі гр. Бенеша а таксама ускладала вянок на магілкі 43 чэскіх ваякаў — героаў і пайшла пакланіцца старэйшай і найслаўнейшай памятцы беларускага друку — біблії Д-ра Ф. Скарыны, якая пераховаецца ў Пражскім Музэю.

У гэты-ж дзень у вечары дэлегаты заслухалі даклады з мейсц тых дэлегатаў, якія спазьніліся на Нараду па незалежным ад іх варунках, і пастанавілі прабыць ў Празе да 3. Х. 21., каб ўсе дэлегаты, што затрымаліся ў дарозе, мелі магчымасьць зрабіць свае даклады.

Рэзалюцыі і дробнасьці кожнага сходу будуць дадзены дадаткова.

Кастусёнак·

▪ ▪ ▪

Савецкая Беларусь.

Водны шлях Савецкай Беларусі.

Каб разгрузіць зялезнадарожны транспарт і зрабіць парадак з грузаабаротам, народны камісарыят дарог арганізаваў тэхнічную камісію для выведак басэйну р. Дняпра.

Камісія абгледзіла ужо перавалачныя пункты Смаленска, Воршы, Магілева, Жлобіна, Рэчыцы, Мозыра, Гомеля, Новабеліцы, Бабруйска. Камісія высьвяліла таксама грузаабарот р. Бярэзіны.

Бярэзіна надта падходзіць для судаходзтва. Зрабіўшы некаторыя землячарпальныя работы, глыбіня яе магла-б дайці глыбіні Дняпра ў Кіеве. Перавалачны пункт будзе зручны для тавараабмена з Польшчаю, Латвіяй і Літвою.

Галоўныя грузы для адпраўкі з Бабруйска— лясныя і шкляныя.

Стварэньне перавалачнага пункту ў Бабруйску зьяўляецца надта памысным, як для адпраўкі робленых там матар'ялаў, так і дзеля разьвіцьця тутэйшай прамысловасьці наагул.

Прадметы вывозкі.

Дрэва. Найбольшым і пераважаючым вытворам зьяўляецца дрэваабрабляючая прамысловасьць.

У даваенны час яна дасягала значнай велічыні. Цяпер заводаў у горадзе ёсьць 15 (8 у горадзе і 7 у павеце), з каторых працуюць 3.

Робленыя заводам дошкі можна-б адпраўляць у вялікай колькасьці у Донецкі басэйн.

Шкло. Другім найбуйнейшым вытворам зьяўляецца шкляная прамысловасьць. Усяго ў павеце ёсьць 3 шкляныя гуты: „Глуша“ „Ялізава“ і „Старава“. Працуець цяпер адна гута „Глуша“. Гута „Ялізава“ рэмантуецца і неўзабаве будзе пушчана ў ход.

На гутах ёсьць ужо вялізная колькасьць гатовага шкла, якое можна-б адсылаць водным шляхам на Украіну.

Пры нармальным ходзе работы што месяца можна будзе выраблівадь да 30 вагонаў шкляных прадметаў, лямпаў, шкла, судзіньня і г. д.

Смалакураны. вытвор у павеце досыць моцна разьвіты. Есьць 35 смалакурняў, глаўным чынам па Рудабельскай і Асіповіцкай чыгуначнай ветцы.

Смалакурні цяпер блізка усе адрэмантаваны і працуюць шыбкім ходам. Смалакурні бліжэйшых паветаў, лікам 150—200, здолеюць пасылаць, карыстаючы пунктам, свой тавар на Украіну.

Цэгла. У павеце ёсьць 4 цагельні, вытворнасьць якіх дасягае 6 міліёнаў цэглін у месяц. Тутэйшыя патрэбы 500.000 цэглін, рэшта цэглы можаць пайці на замен цераз перавалачны пункт на Украіну.

Лесу разьмяркована нарыхтаваць у працоўны час 1921—1922 г. г. — дроў 27 тысяч сажнёвых кубаў і 1.140.000 футовых кубаў ляснога матар'ялу з сасны і вольхі, значную колькасьць стоек, шпал і інш.

Апроч пералічанага, перавалачныя пункты здолеюць перавазіць робленую у гэтым краі—скуру, самадзельныя штукі і іншае.

„Новый Путь“.

Задзержка эшалонаў.

(Уласная карэсп.)

Эшалоны з уцякачамі, па загаду з Масквы, задзержаны ў Менску да 5 лістапада, калі ня будзе новага загаду. Прычына, як можна думаць, палітычная.

Вольны гандаль.

(Уласная карэсп.)

Наднях адчыняецца ў Менску першая прыватная кніжная крама. Прыватныя кнігапрадаўцы звязуць з-за граніцы першы вагон кніг, глаўным чынам, падручнікаў: 60% беларускіх, 20% жыдоўскіх, 10% польскіх і 10% расейскіх.

Занятк ў Унівэрсытэце.

(Уласная карэсп.)

Прыймовыя экзамены ў Менскім Беларускім Унівэрсытэце скончыліся. Пачаліся нармальныя заняткі. Праца замінаецца цеснасьцю унівэрсытецкіх будынкаў, слабым абарудаваньнем лабараторыяў і няхватам навуковых кніг ў Унівэрсытэцкай Бібліатэцы. Патрэбныя рэчы і выданьні сьпешна зьбіраюцца па ўсей Расеі і закупліваюцца за граніцаю.

Усходняя Беларусь.

(Уласная карэсп.)

Агульнае незадаваленьне сярод беларускай савецкай і заграпічнай інтэлігенцыі пануе з-за далучэньня да Маскоўшчыны Усходняй Беларусі. Гэтае пытаньне зьяўляецца глаўнай прычынай халаду ў адносінах беларускіх савецкіх працаўнікоў і савецкай ўлады, але беларускія камуністы стараюцца не чапаць яго, баючыся Масквы. Цікаўна што навет вядомы беларускі камуніст латыш Вільгельм Кнорын цяпер стаіць за далучэньне усходніх беларускіх губэрняў да Савецкае Беларусі.

● ✲ ●

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Навагрэдзкі павет.

Вучыцялі, якіх тут ёсьць дужа многа, сядзяць бяз ніякай працы, бо яны ўсе зарэгістраваліся беларусамі, і ім адмовілі ў пасадах, а прапанавалі ехаць на курсы ў Кракаў. Яны адмовіліся ехаць, за выключэньнем некалькіх, якія згодзіліся ехаць на поўнае ўтрыманьне іх. Другія вучыцялі, не паехаўшыя, заняліся працай на вёсцы, калі ў каго ёсьць маемасьць. Дужа многа зьяўляецца уцекачоў з Савецкай Расеі, якія знаходзяцца у страшэнна цяжкіх матэрыяльных варунках, ня лічучы таго, што знаходзяцца пад адкрытым небам. Лесу на адбудову не даюць. Даюць пазычкі ад нейкай Урадовай Установы з Наваградку, але тым, каторыя маюць зямельную маемасьць, на дзесяціну па 10.000.

Зямлі тут сяляне маюць дужа мала, і лічыцца багатым селянін, маючы 10-15 дзесяцін. У шмат якіх маёнтках парцэлююць зямлю для вайсковых, на што сяляне дужа незадаволены, бо большасьць гэтых салдатаў прысылаецца з Польшчы. Сяляне кажуць: „Мы-б ні чога ня мелі, каб гэтыя салдаты былі надзелены зямлёй нашай, каторыя пайшлі у польскае войска з нашых краёў, а ня галічане і палякі з Польшчы.“

Беларускі рух маець шмат перашкод. Уваднэй гміне вучыцялі больш сьвядомыя с'арганізавалі беларускі гурток, с'арганізавалі вечарыну. Статут каапературыва, які яны сарганізавалі, астаўся не зацьверджаны.

Тутэйшы.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Рэдактар!

Можа знойдзеце места на страніцах Вашай газэты „Беларускія ведамасьці“ зьмясьціць прысланную карэспандэнцыю. Калі яна падойдзець пад Вашу праграму і будзеце друкаваць, то павядомце мяне я яшчэ маю троха вершаў, а можна і напісаць балей, хоць ня ўсё, што думаю.

Шчыра вітаю Вашу газэту. Шкода, што яна мала ходзіць па нашых вёсках. Бяда, што я тут адзін і то ледзьва дзяржуся у сваей беларускай школе 3-ці год. Усе школкі ў нашым павеце пазакрывалі, засталася мая адна, здаецца, на цэлы павет. Можа скора і мая школа замкнецца або пераробіцца на польскую, бо я слухаў польскія курсы ў .... На беларускіх курсах я ня быў, але каб я паехаў на беларускія курсы, а не на польскія, то пэўне у сваей вёсцы ня быў-бы настаўнікам і была-б тут польская школа.

Я ўжо стары беларус, з дзён „Нашае Нівы“, у беларускай школе працую трэці год і ня хочацца пакінуць гэтую школку і беларускую працу.

З шчырым пашанаваньнем . . . . (гэткі-то)

1-га кастрычніка 1921 года.

Дзісеншчына.

Цяжкое жыцьцё выпала на долю жыхароў нашага Дзісенскага павету. Чародныя акупацыі, то палякоў, то бальшавікоў, на шчэнт разьбілі жыцьцё нашых сялян, а нядаўныя рэквізыцыі быдла і дабра, а такжа падводная павіннасьць зусім прыціснулі ўсякі рух сярод іх. Гэтак выглядаюць нашы бедакі-беларусы, гэтак гамоняць аб іх і нашы ворагі. Цёмныя хмары зацягнулі наша неба, і толькі дзе-нядзе выглядае сонейка, сонейка нашай нацыянальнай культуры. У гэтае сонейка, знак лепшай будучыны, верадь нашы сяляне, як у Бога, і аб сваім цяперашнім жыцьці кажуць: „Чым горш для нас робяць, тым лепей будзець“. І гэта надзея на лепшую долю даець магчымасьць больш сьвядомай часьці грамадзянства ўзяцца, хоць і ў трудных варунках, за працу на карысьць роднай культуры.

З гэтай мэтай у сяле Язьне былі пастаўлены тры сьпектаклі, якія прайшлі надта добра. Пастаўлены былі камэдыі «Чорт і баба», «Міхалка», „Па рэвізіі“ і драма дарагога нашага поэта Купалы „Паўлінка“. Было сказана многа вершаў у роднай мове, а на першым сьпектаклі хор пад кіраўніцтвам вядомага ў Дзісьне вучыцеля Карэйва прапяяў дзесяць беларускіх песень, якія прывітаны былі громам воплескаў.

Дужа добра прадстаўлялі нашы артысты ўсе п'есы, так што і тая цёмная часткa людзей, якая раней была супроць нашых тэатраў, цяпер ахвотна бываець на сьпектаклях і просіць, каб ставілі іх часьцей.

Шкода, што нашы хлопцы і дзяўчаты ня ўсе свае сілы аддалі роднай культуры, а ставілі сьпектаклі і ў расейскай мове. Гета разьдзяляець нашы сілы, а ворагам нашым даець прычэпку гукаць, што мы ня можам абыйсьціся бяз чужога.

Праўда сучасныя варункі не дазваляюць аддацца толькі сваей культуры, бо цёмныя сілы з боку часткі нявучонай нашай шляхты і меснай улады дужа тармазяць работу.

На гэтай нядзелі пан рэвіровы з Дзісны сказаў, што каб паставіць сьпектакль на абы-якой мове, то трэба, каб на п'есе было дазваленьне польскай цэнзуры. А тыя п'есы, якія не прагледжаны польскай цэнзурай, трэба пасылаць у Варшаву па дазвол.

Сябра.

М-ка Дзятлава (Слонімскага пав.)

Ціха і спакойна ў раёне нашага мястэчка, толькі калі-ні-калі пранясецца чутка, што ў такім і такім мейсцы бандыты напалі на амерыканца і адабралі грошы, вопратку, а часамі навет і жыцьцё. Вельмі смутна і балюча адклікаецца гэтае зьявішча. Даляры амерыканскія надта вабяць і прыцягваюць да сябе людзей лёгкае нажывы.

Такія выпадкі сталі вельмі часта паўтарацца ў нас, бо адгэтуль шмат нашых хлопцаў перад вайною эмігравалі ў Амерыку, а цепер варочаюцца дамоў, зарабіўшы тысячу, другую даляраў з верою, што так цяжка запрацованыя грошы удасцца спажыць. Тут іх спатыкае вялікае ня-

* * *

У небе пылаюць чырвоныя хмары;
Як горкія мары, на нівы, папары
Кладуцца вячэрнія цені.
Ад пахаў вячэрніх рака, бач, самлела...
Нячутна, пясьмела сьвятло адляцела,
Сплёў месяц празрыстыя сеці...
Ноч сонныя дрэвы прывабіла ласкай,—
Таёмнай, няцяжкай, маўклівою казкай
Апошнія сьцішыла гукі...
Адкінуў злы ветрык далёка жалейку,
Што тугу-зладзейку будзіла зьняцейку,
Адкінуў і ў вецьці схаваўся,
Адна ноч над цёмнай зямлёй варажыла,
Сны-чары насіла, гальлё варушыла...
І горка, а дзіўна маўчала...
А хто разгадаў яе сумы-трывогі?
Мо' лес вечна строгі, мо' месяц двурогі?
Не, хворае сэрца людзкое!

1921 г. Натальля Арсеньнева.

ДЗЕД.

Патухшымі вачыма
Глядзіць на божы сьвет
Стары, у крук сагнуты,
Як голуб, белы дзед.

Пражыў на сьвеце многа:
Бяз нечага сто год;
За век пабачыў гора,
Ня мала вынес слот.

Калісьці да паўстаньня
Рабіў, цярпеў прыгон...
К нямцом ня раз віціны
Ганяў па Нёмне ён.

Меў сілу непамерну,
Здаровы быў, як мур,
Таму так жыва, з песьняй
Гарэ сын родны — „шнур“;

Таму так—шчыры ў працы —
Будуе Край Свой ўнук,
Адважны і бясстрашны,
Не пакладае рук.

А дзед жыве мінулым,
Таёмным і глухім,
Гаворыць бае казкі
Аб даўным і сівым;

Пра войны, панства, войтаў,
Русалак і начніц, —
І хараством чаруе
Няхітры склад быліц.

І часта паглядае
За вёску ён... туды,
Дзе між бяроз пад крыжам
Спачыне ад бяды.

Ды хоць стары, а думку
Гадуе ўсё адну:
Хоць перад сьмерцю ўбачыць
Свабоднай старану!

Валадзімер Жылка.

1921 г.

ПАНШЧЫНА.

I.

Князь забіў на ловах пару вялікіх, прыгожых ласёў. Вясёлы, здаволены, ажыўлёна гамонячы з гасьцямі, вярнуўся ён к вечару дамоў і заказаў кухару засмажыць адменнага зайца, забітага ўчора лоўчым на сьнягу у пушчы.

Жырны, чырвоны той заяц ужо ляжаў на стале у пякарні, і кухар жыва завінуўся ля яго.

Умельствам кухара гардзіўся сам князь і часта хваліўся гасьцям, што другога такога кухара ўва ўсім краі няма.

Кухар гэта ведаў і стараўся паддзержыць сваю славу.

Сягоньня ён асабліва стараўся: князь вярнуўся вясёлы, госьці рагочуць, абед будзе з паляўнічай выпіўкай,—можна й гасьцінца спадзявацца ад іх, а князь назаўтрае пахваліць і добрым часам дасьць чарку гарэлкі.

А не дагодзіш—бяда: зараз пацягнуць гайдукі на стайню і так адсмаляць раменнымі бічамі, што цэлы тыдзень ані сядзеш, ані ляжаш. Быў адзін выпадак (кухар засмуціўся, спомніўшы): перасаліў ён стравы, і князь сам, сваёй цяжкой рукой, так ударыў яго два разы поўху, што й цяпер яшчэ у дрэнную пагоду з вуха гной цячэць. З гэтае прычыны кухар заўсёды насіў у вуху кавалачак мяккага хлопу і дрэнна чуў. І ці мала было такіх выпадкаў, што забіў-бы яго гнеўны князь да сьмерці ці здаў-бы ў салдаты, каб не даражыў яго залатымі рукамі і тонкім кухонным смакам. Пасьля калецтва прыкра было відзець князю кухара з заткнутым вухам, і ён ніколі ўжо ня гукаў яго на параду аб стравах да сябе, а пераказываў праз стольніка.

Ды сяньня князь быў у гэткім нязвычайным гумары, што першы раз захацеў сам пагаманіць з ім аб спосабе смажэньня зайца.

Калі хлопчык-гайдучок прыбег з палацу у пякарню (яна зьмяшчалася водаль, у васобным, адумысным будыначку), калі ён запыханы крыкнуў кухару: „Дзядзьку яснавяльможны кліча да сябе... барджэй!“—у кухара затрасьліся ад неспадзеўкі рукі і зазьвінела ў хворым вуху. Ен ня ведаў, пужацца ці радавацца яму? Падняў уронены рушнік, абцёр з рукі зайцову кроў і рупліва прыгладзіў лысіну і падкруціў вус.

— „Піражка... піражка, Янучок!“— саромліва, безраўнавагі зашаптаў ён гайдучку, агледзіўся наўкол, каб хто ня відзіў, схапіў з духоўкі румяны піражок і ўсунуў хлопчыку ў кішэню за добру вестку. Хлопчык быў рад, пагладзіў вялізнага адгадаванага ката, князёвага ўлюбёнца, што прыбег за хлопчыкам з пакояў, і паганяў дзядзьку: „Барджэй, барджэй! Чакае!“ І зараз памчаліся: хлопчык наперадзе, а кухар сьледам, на хаду спушчаючы засуканы рукаў.

Толькі мышасты кот астаўся, за недаглядам зачынены у кухні. Ен важна пахадзіў па стале, панюхаў зайца, потым глянуў пераз адчыненыя дзьверы ў чорны прыкухоньнік, дзе два малодшых кухары і судамой і хлопчык-дрыванос рабілі сваю работу.

Кату прыемна засьвярбела ў носе, ён глыбока пацягнуў пах ад вялізнае гарачае пліты, на якой бяз ліку стаяла рознага судзіньня з гатаванымі стравамі, клубілася з катла пара, шляхатала вада, сіпелі скавародкі, трэскалі дровы ў печы. Але бліскаиьне на паліцах соцен медных рондаляў (каструляў) усялякай велічыні, ад самай большай увелькі з цэбар да самай малюсенькай з катову галаву,—не спадабалася яму. Там былі адчынены другія дзьверы, і скрозь іх цягнуўся холад, можна было выскачыць на двор, але пануры выгляд кухароў, асабліва-ж хлопчык-дрыванос з вяроўкаю ў руках не спадабаліся князёваму ўлюбёнцу, і ён пайшоў, задраўшы тоўсты хвост, назад. Вучоны да ўсякіх штукаў, кот падскочыў, ударыўся ў клямку і расчыніў дзьверы. У сенцах узьлез на паліцу і насташражыўся: пачуў скрабаньне у скрынцы з крупамі.

Тымчасам у дзьверы вытыркнуліся з надвор'я морды двух хартоў — тонкіх як вужакі, сагнутых дугою. Адзін з іх пацягнуў носам і зараз зьнюхаў зайца. Мякка, нячутна падыйшоў да столу, задраў вострую морду, схапіў у шырачэнную зяпу зайцову галаву і цмыгнуў з сваім радым сябрам на двор у хартоўню.

Усьцешаны варочаўся назад глаўны кухар: князь з ім быў дужа ласкавы і навет даў пацалаваць сабе у руку.

Але колькі ўжо выпадкаў было ў гісторыі, што з самае вяршыны шчасьця чалавек раптоўна зваліваўся ў самае бяздоньне юдолі плача і адчаю.

Шчасьлівы кухар, праходзячы міма хартоўні, пачуў у пуньцы хрустаньне, чаўканьне і ціхае вурчэньне... Харты штось пажыралі!

Хто ня ймець веры ў прадчуцьці, той, мабыць, гора не зазнаў ніколі у сваім жыцьці. Кухар меў яго даволі за свой марны век, і сэрца яго ёкнула: ці ня зайца жаруць праклятыя сабакі, падобныя да чартоў?

Угрунь пабег ён да свае кухні, ускочыў, падбег да столу: зайца няма! Болем пёканула ў кухарава сэрца. Ен кінуўся у прыкухоньнік, шыбка агледзіў усё і ўсіх. Зайца ня было, і кожны спакойна займаўся сваей работай. Як бы за якой справай выйшаў кухар ізноў на двор і марудна, прыціснуты няшчасьцем, паплёўся міма хартоўні, асьцярожна спаглядаючы у бок на сабачыя пунькі. Вось паказалася з аднае хартовая галава: морда ў крыві, вочы заплылі платаядным здаваленьнем і ў зубах штось тырчыць... Хорт аблізнуўся, із зяпы выпала заячая лапка!

Кухар панура паплёўся назад.

Увайшоўшы ў сенцы, ён прістоіў там, як няпрытомны, і мімаволі задраў галаву, шукаючы крука, дзе-б павесіцца.

І тут яшчэ раз трэба сказаць, што чалавек ніколі ня ведае, дзе згубіць, а дзе знойдзець. І няма такой злыбяды на сьвеце, на якую-б ня усьміхнуўся неспадзеўны, нечаканы ратунак.

У вочы кухару кінуўся ляжачы на паліцы кот — вялікі, адгадаваны, мякінька - пушысты, як той заяц.

Адчайная думка пранзіла кухараў мозаг, і ён паманіў князёвага ката к сабе выстаўленымі пальцамі. Кот прыжмуранымі вачыма зьмерыў постаць старшога кухара, важачы яго вартасьць у каціных вачох. Ад кухара прыемна пахла, вочы яго былі пакорна-ласкавыя, і кот патрошку, важна стаў падхадзіць да выстаўленых пальцаў. Як толькі ён дакнуўся іх сваёю гладкаю, шаўковаю шэрсткаю, пальцы з дзікай зьнявагаю абхапілі яго карак і пацягнулі у паветра. Кот захлынуўся ад шалёнай злосьці й крыўды. Абдумаўшысь, ён люта ашчэрыў зубы, заглабаў кіпцямі і закруціў хвастом; абраз князя стаяў у выкачаных з галавы вачовых яблыках і напаўняў каціна сэрца зласьлівай радасьцю бясьсільнага, што ворагу князёвага ўлюбёнца будзе лютая кара за гэты зьдзек. Ды пальцы сьцягнулі яго карак мёртваю патлёю і нясьлі ў брыдкім паветры да дзьвераў прыкухоньніка. Калі дзьверы за людзьмі зашчапіліся на чэп, у вольнай руцэ адзінокага кухара бліснуў вялізны, жудасны кухонны нож. Кот сабраў астаткі сілаў, сударжна ірвануўся і згубіў прытомнасьць. Гарачая кроў палілася з яго парэзанага горла, і наступіла вечнасьць.

У вадзін мамэнт садраная скурка была кінута у дальні кут пад печ, а чырвоны, жырны аблуплены катовы труп з адсечанай галавою, ляжаў, як добры, адменны заяц, на стале. Кухаравы рукі набраліся цьвёрдасьці, сэрца патроху сьціхла

шчасьце; грошы, як я пісаў вышэй адбіраюцца бандытамі. А паліцыя сьпіць. Некаторыя бязрадасныя галовы цьвердзяць, што паліцыя, гэтая грозная пяня нашага жыцьця, нічога не парадзіць з бядою, ня гледзячы на руплівую дзейнасьць, пасылаючы на месца выпадку франтаватых паліцыянтаў, з вельмі выклікаючым відам. Страх бедным бяз грошай, а яшчэ горшы—багатым з грашыма.

А вёска жыве сваім штодзенным жыцьцём. Работа на полі скончана: жыта пасеена, толькі яшчэ красуецца бульба, дык тую зараз выкапаюць. Ціха спакойна. Здаецца, што ўсё робіцца спакойна, без усякіх перамен, як раней, ува ўсіх галінах нашага жыцьця. Але не. Школа... вось тут работа кіпіць назвычайна: увесь Слонімскі павет запруджаны новымі культурнымі сіламі—вучыцелямі з Кракава, Варшавы, а тутэйшыя, часьцю выкінуты за борт школы няміласэрнаю рукою прадстаўніка сьвету і навукі—школьным павятовым інспэктарам, часьцю засталіся і становяць вельмі малы процэнт культурных работнікаў у справе асьвячэньня нашых „тутэйшых" грамадзян.

Няўжо-ж так будзе далей?—нясуцца пытаньні, і не знаходзячы здавальняючага адказу, робяцца сумнымі зацікаўленыя такім зьявішчам. Ужо мусіць такі нам лёс... Гэта з аднаго боку, з другога—вера сьвятая была, ёсьць і будзе ў сэрцы лепшых грамадзян нашае старонкі. Яна—вера сьвятая, створыць дзіва, у чым бо пэўнае перакананьне.

Нова-Дворская вол. (Сакольскага пав.)

Як ведама, Сакольшчына ужо даўно прылучана да Польшчы, ня пытаючыся нас, сакольскіх беларусаў. Нас цяпер хочуць вырабіць на свой капыл, хочуць з нас зрабіць палякоў: паадчынялі (ў іншых месцах прымусам) польскія школы, пабралі маладых мужчын у войска, пазачынялі цэрквы, па ўсіх урадах, навет гмінах, прымушаюць гаварыць абавязкова папольску, гаворачаму пабеларуску не адказваюць. Жыцьцё зрабілася для нас цяжкім. У кождай вёсцы жыхароў разьдзялілі на два лагеры, хутчэй сказаць на два народы па рэлігіі: каталікоў называюць палякамі, а праваслаўных рускімі, і апошнія заўсёды лаюцца на грунце дзяржаўнасьці.

З каталікоў бяруць страшэнныя грошы на адбудову касьцёлаў з царквей: каб пахаваць памерлага з ксяндзам, трэба дзесяць пудоў жыта, што выносіць на цяперашнюю валюту каля 15.000 польск. марак; за шлюб бяруць яшчэ болей. Але усё гэта нічога: кожны цёмны каталік-беларус гатоў аддаць сваю апошнюю сарочку на касьцёл і на „сьвенту вяру".

Ксёндз у воласьці цар і бог, ні адзін сход, ні адныя выбары не абыдуцца без яго, усюды ён кіруе. Нядаўна ў Новым Двары на просьбе праваслаўных сялян была адчынена Нова-Дворская царква. Учуўшы, сяляне з усіх вёсак, як на ўрачыстасьць, сабраліся да царквы, так што навет мейсца не хапіла ў царкве, дык сталі за брамаю, дзівіліся ўсе каталікі, скуль магло набрацца столькі, як яны кажуць, „кацапаў", і данесьлі ксяндзу, а ксёндз знай сваю справу—зараз да жандараў, да Сакольскага Старосты, а можа навет і далей данёс, і царкву на трэці тыдзень зачынілі.

Сьвядомых беларусаў зусім мала, трэба ўсім, каму дорага справа роднай Сакольшчыны, паважна падумаць і паклапаціцца аб усьведамленьні, першым чынам трэба газэты, бо ніякіх арганізацыяў легальных закладаць немагчыма. Нас ёсьць гурток, хоць невялічкі, сьвядомых беларусаў, каторы і зьвяртаецца да Нацыянальна-Палітычнай Нарады ў Празе-Чэшскай паклапаціцца і аб нашай Сакольшчыне, бо мы-ж таксама беларусы, але, дзеля таго што мы загнаны, сваіх прадстаўнікоў паслаць на Нараду ня можам.

Селянін.

М. Крынкі, Горадзенскага пав.

I.

Крынскі Кружок Беларускае Моладзі меўся паставіць сьпектакль, паўгарыць драму „Манька" і камэдыю „Модны Шляхцюк". Былі разьвешаны у мястэчку рэклямныя афішы. Адна з афішаў была напісана на польскай мове, праўда ў ёй было дужа многа памылак, бо ніводзін сябра кружка ня ведае польскае мовы. Была на афішы такая рэкляма, намаляваная сябрам кружка: „Моднага шляхцюка" тузаюць за нагавіцы сабакі, а ён крычыць: „Poszed won"! I вось у ноч з 24-га на 25-ая верасьня г. г. некая патаёмная сіла сарвала гэтую афішу. Было чуваць, што сябры кружка вельмі шкадавалі яе, бо вывешана яна была ў суботу 24-га (тады яе і сарвалі), а ў нядзелю 25-га верасьня трэ было ставіць сьпектакль, дый баяліся, што на вечарыну прыдзе мала людзёў. Другія сябры, было чутно, гаварылі: „Вось якія мы, беларусы, няшчасныя, адзін раз аставілі афішы нанач і то сарвалі, больш ніколі ня будзема гэтак рабіць".

Сапрон. Дзяга.

II.

Будынак, у якім месьціцца беларуская пачаткавая школа — гэта быўшая жаноцкая паркоўнапрыхадзкая школа, пабудованая на кошт прыхода. Ен належыць праваслаўным, якія у цяперашнім моманце сьвядомыя беларусы, жадаючыя вучыць сваіх дзяцей у роднай беларускай мове, дзеля чаго пад школу і занялі упамянуты будынак.

8 верасьня г. г. польскі вучыцель «powszechnaje szkoły», ён-жа і кіраўнік тутэйшых школ, як польскіх, так і беларускіх, закрыў беларускую школу без ніякіх прычынаў. Вучыцель гэтае школы зьвярнуўся да інспэктара ў Горадні, каб даведацца, з якіх прычынаў закрылі яго школку; замест адказу, інспэктар звольніў яго, а дэлегата, які быў пасланы ад жыхароў м. Крынак аб жаданьні, каб ім адкрылі іхную беларускую школу, пан павятовы інспэктар, узяўшы прыгавар, адправіў ні з чым.

Гэтым часам ужо у м. Крынках беларускую пачатковую школу перахрысьцілі. у „powszechnuju szkołku". У школу без свайго вучыцеля і пад гэткім названьнем дзеці праваслаўных беларусаў перасталі хадзіць, а наведывалі яе толькі дзеці, праведзеныя з польскае школы.

Гэтак і закрылі беларускую пачаткавую школу — адну на ўвесь Гарадзенскі павет, апрыч Горадні.

Вехаць.

Докшыцы, Дунілаўскага павету.

Яшчэ ў чэрвеню месяцы г. г. ў „Докшыцкім занепадзе" па вёсках пачалась агітацыя за расейскую школу. Агітатарамі былі маскоўцы, каторыя засталіся ў нашым краі. Трэба сказаць праўду, што знайшліся навет сярод беларусаў такія, каторыя выракліся свайго беларускага народу—зрабіліся зраднікамі, душапрадаўцамі, пашлі на ўслугі чужакам і агітавалі за расейскую школу. Такія зраднікі добра ведалі, што расейская школа навучыць беларускіх дзяцей любіць чужое і зьневажаць сваё роднае, свой народ, сваю мову і свае звычаі. Такія людзі гатовы агітаваць за якую ўгодна школу, каб толькі ня была школа беларуская.

Пасьля таго, калі маскоўцам і „нашым зраднікам" удалося ашукаць нашага цёмнага, забітага працай беларуса і калі гэтая кампанія мела дастатачны лік подпісаў беларусаў, то збралі дэлегацыю і паслалі ў Парафіянава, гдзе быў Начальнік Польскай Дзяржавы п. Пілсудзкі, і прасілі дазволу на расейскія пачатковыя школы.

Дэлегацыя вярнулася з Парафіянава і разам з „Юдамі-прадацелямі" сьвяткавалі сьвята, што яны надта лёгка зьбілі з той дарогі, па каторай трэба было ісьці беларусу (яны былі пеўны, што расейская школа будзець істнаваць).

Але радасьць была надта пасьпешна. На тым тыдні прыяжджаў школьны інспэктар Дунілаўскага павету, і прывёзшы заявы, паданыя делегацыей, сабраў частку беларусаў, падпісаўшых просьбы і абвесьціў: „Расейская школа істнаваць тут ня можаць"

Дзеля таго, каб беларусы „Докшыцкага занепада" ўзноў ня папалі на вудачку „усякім прахадзімцам", зьвяртаюся к панам беларусам-настаўнікам, каторыя не атрымалі пасады, з славамі слаўнага нашага паэта:

„За работу жыва, жыва!
Каб нас доля ня кідала,
Каб ня сохла наша ніва,
Каб нуда нас не чапала"

26/IX. 21 г. К.

Валожынская воласьць.

I.

Сьпяшаў із курсаў я дамоў,
Каб ў сваёй школе і з ахвотай
Пачаць энэргычна працаваць ізноў.
Пачакаўшы нейкі час,
Пан Інспэктар Валожынскі
Загукаў вось які наказ:
— „Беларускія школы будуць усе закрыты,
А на места іх, дзе жывуць беларусы,
Будуць нашы польскія адкрыты!"
Тады я з сьціснутай душой
Пайшоў да пана Інспэктора
Пагаманіць аб цяжкой справе такой,
Прышоўшы, стаў яго прасіць:
— „ Калі ня можна школы мець скарбовай,
Дык разрашыце хоць прыватную адчыніць".
Пан Інспэктар з крэсла ўстаў
I, нічога мне не сказаўшы,
На проць у каморку патрапаў...
Доўга, доўга я чакаў,
Пакуль вышаў пан Інспэктар,
На маю просьбу адказаў:
— „А ніякіх школ ня будзе,
Бо ад іх надта цяжка, надта нудна людзям.
Прыказ мой гэты ёсьць дакананы,
З гэтай мэтай, каб беларускія школы зачыніць,
I вучыцелі ўсе заранё адваланы."

В. Бядак.

II.

Колькі дзён таму назад прышлося мне па аднэй патрэбе быць у сваей гміне. Божа мой! што тут робіцца, як толькі ні сьмяюцца над нашым братам—беларусам. Праўда, пан войт добры чалавек, але ён з-за сваіх справаў рэдка бывае ў гміне, а замест яго сядзіць нейкі малады пан, ды такі благі, што сяляне ня ведаюць, як да яго дастуліцца. Называюць яго панам і паночкам, але ён не зьвяртае ніякае ўвагі. Ад вышаўшых із канцэлярыі людзей толькі і чуваць разгаворы: „Што-ж, хто ўмее з панам пагаварыць па польску, дык ён усё добра зробіць і слухае, што яму скажуць, а як мы ня ўмеем, дык нас і слухаць ня хоча, толькі закрычыць: „Nic nie wiem" ды яшчэ хлыстом патрасе, які носіць заўсёды пры рамені. А другія пытаюцца; „Але адкуль гэта ён прыехаў такі благі, пеўне з Галіцыі?" — „З якое табе Галіцыі, гэтаж-ж сын быўшага панскага аб'ежчыка Тумалевіча". — „А-а-а, дык вот што!, не дарма ў прыказцы гаворыцца; „Які дуб, такі клін, — які бацька, такі і сын."

Валожынец.

ЭКАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ.

Зьзд прадстаўнікоў Краёвых Саюзаў Кааператываў.

Зьезд, склікаңы Віленскім Саюзам Кааператываў на 26 верасьня на 6 гадзіну вечара, быў адчынены каля 7 гадзіны Старшынёй Управы Віленскага Саюза А. Трэпка. На зьезд зьявіліcь гэткія кааператыўныя аб'яднаньні: 2 прадстаўнікі ад Віленскага Саюзу, 2 ад Лідзкага, 1 ад „Związku stowarzyszeń spożywców Ziemi Wileńskiej", 1 ад Навагрaдзкага, 1 ад Польскага Саюза „Сполэм", 1 ад Баранавіцкага Аддзелу „Сполэм", 1 ад Бюро Закупак жыдоўскіх кааператываў г. Вільні і па два ад Рад Віленскага Саюза ў Дукштах і Маладзечне.

Старшынёй Зьезду выбран п. Трэпка, сэкрэтаром п. Вольскі.

У сваёй прамове Старшыня Зьезду, вітаючы сабраўшыхся, зазначаець, што цяжкія варункі кааператыўнага жыцьця, як: дарагоўля, валюта, канкурэнцыя і г. д., змушаюць саюзы паставіць на парадак дня аб'яднаньне ўсіх саюзаў.

Доўгія гутаркі вызвала пытаньне, як назваць зьезд, бо на зьезд явілася шмат кааператараў, зацікаўленых зьездам. Вырашана, што гэта зьезд „прадстаўнікоў саюзаў і кааператараў".

Прадстаўнік Лідзкага Саюза Шаптуноўскі дакладывае аб становішчы Лідзкага Саюзу і высьвятляе: што Саюз мае 32 таварыствы, дзействуе на абшары ўсяго Лідзкага і часткі Ваўкавыскага павету, аб'ядновывае 12-15000 спажыўцоў, мае

калаціцца, і кухарская работа закіпела. Час-адчасу кухар шаптаў „Вочча наш", хрысьціўся, абціраў пот, але маўкліва, старанна смажыў, перчыў, паліваў...

II

Першы раз за ўсё жыцьцё еў князь і яго госьці такого смашнога зайца. — „Вот заяц — дык заяц! — хвалілі госьці; — пальчыкі аблізаць." Князь прыемна ухмыляўся і часам навет каяўся, нашто калісьці ў страшным гневе скалечыў кухара. — „Заяц добры, але і кухар мой нягоршы, — хваліўся ён: — граф Зібэр-Плятэр суліў мне летась за яго трыста злотых, ды я й за тысячу не аддам; мяркуйце, панове, самі: залатыя рукі, што?"

Гутарка узьбілася на залатога кухара, і падвыпіўшыя госьці захацелі паглядзець на яго. Паслалі гайдука ў пякарню, каб прывёў. — „Скуль ясьневяльможны дастаў яго?" — пытаўся граф Бжастоўскі, вядомы у сваім часе на усю Рэч Паспалітую дуэліста і забойца аднаго В-га ксяндза.

Хто чытаець старынныя кнігі, той ведаець аб гэтым скандальным забойстве графам жартаўлівага ксяндза, быўшага яго духаўніка і друга. Для няведаючых — кароценькая спраўка. Ксёндз быў з дробнай шляхты і за чаркай мёду любіў, па жартаўлівасьці сваей натуры, пасьмяяцца над важнымі тытуламі. Аднойчы, гасьцюючы ў графа ў Бжаставіцах, у цеснай выпівацкай кумпаніі, у якой быў і граф, ксёндз гэты апавядаў вядомую беларускую лягенду аб пахаджэньні князёў і графаў. — „Калі бог тварыў людзей, дык кандыдатаў на князёў і графаў ён памазаў маслам. А нейкі падла-сабака, смакуючы масла, прыбег і зьеў памазаных. Загневаны бог схапіў яго за хвост і пачаў трэсьці. З-пад хваста пасыпаліся кандыдаты, і які зваліўся пад вішню, зрабіўся князь Вішнявецкі, каторы пад асіну — граф Асіноўскі, а той, што пад бярозу, той граф Бжастоўскі, пабеларуску Берастоўскі"... Шалёны граф, самалюбны ў тытульных справах, прымусіў свайго духаўніка тут-жа, у кабінэце, стаць з ім на паядзінак і забіў з пісталета перабраўшага мерку, хмельнага ксяндза, за што мусіў на нейкі час навет уцячы ад каралеўскага суда за межы Рэчы Паспалітай.

—Скуль ясьневяльможны дастаў яго? — спытаўся ў князя аб кухары гэты самы граф Бжастоўскі.

— Мой падданы... тутэйшы. Ні ў Парыжы, ні ў Варшаве ня вучыўся, — мабыць, з кухоным геніем радзіўся.

— Што-ж так доўга не вядуць генія сюды? — запытыўся адзін пануры стары пан.

Князю не спадабаліся гэтыя словы, ён нахмурыўся і паслаў другога гайдука. Той ведаў князеў гнеў і помчаўся, як страла.

Тым часам з кухарам рабілася няма ведама што. Першы пасланец, зьдзіўлены, нерашучы стаяў над ім, старым, і ня мог даць рады, каб ішоў да князя.

Кухар зьбялеў, дрыжэў і не казаў ні слова. Ен глядзеў на пасланца вытрышчанымі вачыма і ня рушыўся з месца, быццам прыліпшы. Потым, урэшце, паволі скрануўся і пабрыў у сваю каморку, побач з прыкухоньнікам. Асунуўся там на калені, злажыў перад абразом рукі далонямі, як на малітву, і ўзноў там скамянеў. Не маліўся, ня кланяўся, толькі стаяў на каленях і глядзеў на вобраз.

Доўга прастаяў-бы ён так, каб ня прыбег другі пасланы. Тады двое гайдукоў схапілі незразумела здурнеўшага кухара пад пашкі і пацягнулі у палац. Ногі яго ня йшлі, згібаліся, лоб узапрэў, змярцьвеласьць на твары не зьмяншалася.

— Упіўся ты з радасьці ай што?—крычэў на яго старшы гайдук. — Князь хоча паказаць цябе гасьцём, які ты, знацца, ёсьць штукар зайцоў смажыць, а ты й язык высалупіў... Ідзі ўжо сам! — і піхнуў яго зьлёгку ў бок.

Але кухар заваліўся на сьнег і ня йшоў. Потым ён схапіўся рукою за грудзі і балюча застагнаў: „Ай, людцы, сэрца, сэрца баліць!"

Гайдукі спужаліся запраўды, але ня важылісь марудзіць і, схапіўшы яго, пацягнулі далей. Чэлядзь, якая бачыла гэты абраз, з подзівам і страхам прыглядалася, уважаючы, што кухар правінаваціўся і яго цягнуць катаваць. З палацу выскачыў стольнік. Спытаўшыся на бягу, што такое, схапіў жменю сьнегу і пацёр кухару лоб. Тады ён трохі ачуняў і слаба паплёўся сам.

Калі гайдукі адчынілі дзьверы ядальнага пакою, паны шумна гаманілі, наперабой хвалячыся сваімі ўдачамі на ловах, рагаталі, строілі розныя жарты на свой панскі манер. Граф Бжастоўскі першы заўважыў і сьмяючыся закрычэў: „Генія, генія, здаецца, прывялі!"

— А, вось ён геній..., — прабурчэў пануры стары пан і усьміхнуўся: — праўда, якісь асаблівы, быццам з таго сьвету... Але зайца смажыць мастак!

Госьці патроху сьціхлі і павярнулі галавы туды, дзе між двух рослых, здаровых, як дуб'ё, гайдукоў, стаяў пахілены, зьбялелы кухар.

— Што табе зьдзеілася, дурню? — скажы-тка нам, як ты смажыў зайца?

Кухар толькі шавяліў васковымі вустамі і нічога не казаў.

Князю было прыкра, што яго чалядзінец такі затуканы і баязьлівы.

— Што табе, дурню? — ізноў спытаўся ён грэблівым голасам; — чаго без пары спужаўся: за добрую работу будзеш мець добрую заплату.

Кухар зразумеў гэта, як пагрозу, і асунуўся на каленькі.

— Князёчку! — залямантаваў ён, — харты яснай міласьці, харты, каб на іх паляруш!

Ніхто нічога не разумеў. Харты яго спужалі ці што? Князь насупіўся, што кухар папсаваў яму добры гумар. Але ён не хацеў крута мяняць такую нядаўную ласку на гнеў і намерыўся яшчэ раз спытацца, у чым справа. Толькі ён тое падумаў, як кухар скручыўся і схапіўся абедзьвюма рукамі за грудзі.

— Ой, сэрца, людцы! Ой, сэрца!..

— З ім сардэчны прыпадак ад якога-сь перапуду, — сказаў пануры стары пан і стаў ліць у шклянку сьцюдзёнае вады, каб ратаваць няшчаснага; ён знаўся на лячэньні хвароб. — На, выпі, галубец, — прыклаў ён да зубоў кухара зазьвінеўшую шклянку і з прыючай ironiяй дадаў: — сардэчная хвароба — хвароба геніяў.

— Ой, людцы! Ой, людцы! — жаласна і сьмяхотна лямантаваў кухар, скрабучы грудзі кіпцямі

Усім зрабілася ніякава.

— Гэта мы яму—„людцы",—усьміхнуўся шляхетны граф Бжастоўскі на простую мову кухара

— Вядзіце яго! — загадаў князь гайдукам. — Хартоў спужаўся, як дзіця... — прабурчэў ён усьлед падданаму і для супакою гасьцей зьвярнуўся голасна і як нічога ня было: „Гэта што — пара ласёў! Вось як мы летась палявалі з графам Зібэр-Плятэрам, — зуброў накрылі ў маёй дальнай пушчы...

— Зуброў?!

— Зуброў?!

I шумная лоўчая размова паноў аднавілася. Зараз забыліся аб смашным зайцу і аб хворым кухару.

III.

Хворы кухар стагнаў на ложку у сваёй каморцы.

Зьявіўся дваровы фэльчар, даў выпіць супакойных капак, пытаўся, як сталася хвароба. Не дабіўшыся ніякага адказу, махнуў рукою і пайшоў сабе.

Малодшыя кухары ад смутку і дзеля спачуцьця—выпілі, і сваім гоманам дурылі галаву хвораму.

Позна ўвечары прыбег захныканы гайдучок Ясюк шукаць запрапашчонага ката. Ён аблазіў усе куткі ў пякарні і нідзе яго не знайшоў, толькі выцягнуў з запечча зайчую скурачку, якая дужа нагадавала яму ката. З ёю ў руцэ прышоў ён да хворага, калі там нікога ўжо ня было, і стаў плакаць і жаліцца дзядзьку, што баіцца князя за ката.

— Можа ўцёк у лес... Можа сабакі разарвалі... Заўтра яснавяльможны спытаецца, дзе кот... Што я скажу? Гу-гу-гу, — румзаў бедны хлопчык, прыпаўшы да скуркі тварам. — Вось ён такі быў гладзенькі, як зайчык... Прышоў са мною сюды ў пякарню, а потым, ня ведаю, дзе дзеўся?.

— Ня ве-едаеш, Ясюк? — узьняўся з ложка хворы і уталопіўся па мальца зьдзіўленым паглядам. — Ня вэдаеш, дзе падзеўся твой... гэты... кот?!

— Ня ве-е-едаю-ю, гу-гу-гу, — ня сунімаўся, плакаў Ясюк. — Можа ўцёк у лес ці на вёску, сабакі там мужыцкія разарвуць яго, гу-гу-гу...

— А ў пакоях ніхто ня ведае дзе ён, халера, падзеўся? — ажывіўся хворы кухар.

— Ніхто ня ведае, ня відзелі... ўва ўсіх пытаўся. Што мне цяперака рабіць, дзядзечка, гу-гу гу, будуць сячы мяне, што ня ўпільнаваў.

Сьмяротны ціжар раптам скаціўся з кухаравых плеч. Вялікім шчасьцем засьвяціліся змучаныя, праваленыя, з сінякамі ад сардэчнае хваробы вочы. Ком радасьці ускалыхнуў збалелыя грудзі. Спачуцьцё шчасьлівага да няшчаснага сфальшывіла чыстую у муках душу чалавека. З няшчырай пяшчотаю ўцалелага ў агульнай катастрофе прыцягнуў кухар хлопчыка да сябе, прытуліў, гладзіў па галоўцы, жалеў, кажучы з найбольшай даступнай яму ласкавасьцю:

— Дзетка маё! Сіротачка мой бедны! Ня бойся, ня плач, неяк-жа абойдзецца. Ну, абсякуць, натое-ж мы слугі панскія, каб нас секлі. Ня бойся, да сьмерці-ж не заб'юць. Во й мяне колькі разоў секлі, — нічога, неяк-жа мадзею... Супакойся, мой Ясючок, галубок мой! Здохні ён, кот! Можа, яшчэ й знойдзецца. Калі сабакі не разарвалі, вернецца, як захоча есьці, ліха яго ня возьме... Цябе князь любіць, можа й даруе, калі навет і згіне гэты падла.

Хлопчык, круглы сіротка, узяты з вёскі ў замак ад малых гадоў, рэдка чуў такую бацькаўскую гутарку. Ен паволі змаўкаў, сьціха хліпаючы ня столькі ад гора, колькі ад расчуленасьці. Ласка старога кухара, даўшага яму сяньня піражок, растапіла яго сэрца, як цяпло растапліваe воск. Хлопчык прыпаў да кухаравай рукі і пацаваў яе так, як цалуюць рэдкія дзеці у рукі сваім бацьком. Скурка выпаўзла з яго далоні і скацілася на ложак. Кухар зоркасачыў за ёю і ўбачыўшы злучнасьць, пасунуў локцям назад, і яна звалілася за ложак. Тады кухар пачаў умаўляць хлопчыка, каб ён ішоў класьціся спаць.

— А як-жа, дзядзька, хворы адзін будзеце ляжаць? — з дзяціным прыяньнем спытаўся хлопчык, паглядзеўшы на старога чысьценькімі, абсохлымі ад слёз вочкамі.

— Нічога, Ясюк! Не шкадуй мяне, бо мне ўжо крышку лепей...

21 VIII-1921 г. Максім Гарэцкі.

чы на 100 мар. ад кожнага сябры, аб'яднанага ў таварыстве. Абароту ў апошнім месяцы зробіў 6.000.000. Саюз «wzorował się» на Польскі Саюз Спажывецкіх Таварыстваў. Мае 2 інструктароў, якіх лепей варта назваць рахункаводамі. Саюз прыймае таварыствы без абсьледаваньня і дагэтуль абсьледаваны інструктарамі толькі ³/₄ таварыстваў. Ні да якога саюзу не ўваходзіць, але ідэёва і гандлёва цягацее да Польскага Саюзу Спажывецкіх Таварыстваў.

Прадстаўнік „Związku Stowarzyszeń Ziemi Wileńskiej" п. Петкевіч заяўляе: што дзеля таго што Віленскі Саюз істнуе глаўным чынам для вясковых кааператываў, гэты Саюз не задавальняў гарадзкія кааператывы. Такі стан змусіў гарадзкія кааператывы аб'яднацца ў гарадзкое аб'яднаньне, але дзеля таго што жыдоўскія і літоўскія кааператывы ад гэтага аб'яднаньня адпалі, Саюз стаў выключна польскім і расшырыў сваю дзейнасьць на ўсю Віленшчыну. Мае саюз 16 таварыстваў, аб'ядновывае 23.000 сяброў, лічучы „Ligu Robotniczu" і „Polski Związki Zawodowe", атрымлівае па 50 мар. ад сябры. Істнуе колькі месяцаў. Мае крэдыт у 32 мілёны „на веру" без абясьпекі кааператываў.

Навагрудзкі Саюз састаіць сябрам Віленскага Саюзу, мае 30 таварыстваў, працуе на абшары Навагрудзкага павету.

Бюро жыдоўскіх кааператываў гор. Вільні створылася дзеля атрыманьня дапамогі ад жыдоўскага банку.

Слонімскі Саюз ня прыехаў на зьезд. Апанаваны ён палітычнай арганізацыяй „Страж Крэсовая" і ніякай кааператыўнай вагі ня мае.

Пасьля гутарак на паседжаньні прыняты вось якія прапазыцыі п. Вольскага і прадстаўніка „Сполэма" п. Кшаноўскага:

1) Канфэрэнцыя прызнае немагчымым істнаваньне на абшарах, эканамічна цягацеючых да Вільні, ня зьвязаных з сабою арганізацыйна і часта канкурыруючых Саюзаў Спажывецкіх Таварыстваў.

2) Канфэрэнцыя прызнае за канечнае якнайшыбчэйшае злучэньня ўсіх істнуючых у Віленшчыне Саюзаў Спажывецкіх Таварыстваў.

На другі дзень раньня канфэрэнцыя адчынілася супольным непаразуменьнем прадстаўнікоў Саюзаў. Аб злучэньні ўсіх Саюзаў ужо не гаварылася, а п. Вольскі дамагаўся як найшыбчэйшага злучаньня пакуль што толькі двух Саюзаў: Віленскага і „Ziemi Wileńskiej". Прадстаўнікі Віленскага Саюзу Кааператываў настаівалі на злучэньні ўсіх Саюзаў, якія толькі істнуюць у Віленшчыне.

Пасьля доўгіх гутарак увечары прынята была пагодзіўшая ўсіх вось якая рэзалюцыя:

1) Канфэрэнцыя прызывае Віленскі Саюз Кааператываў, „Związek Ziemi Wileński" і іншыя краёвыя Саюзы Спажывецкіх Таварыстваў да як найшыбчэйшага зьліцьця ў адзін Агульнакраёвы Саюз Таварыстваў і асобных Саюзаў.

2) Канфэрэнцыя прызывае вышэйназваныя Саюзы, каб у працягу тыдня склікалі камісію з прадстаўнікоў Саюзаў для апрацаваньня Статуту будучага Агульнакраёвага Саюзу, а таксама для абсьледаваньня Саюзаў і устанаўленьня сьпіскаў іх сяброў.

3) Зараз-жа па скончэньні працы камісіі, Саюзы, якія злучаюцца, павінны якнайскарэй склікаць у вадным часе ў Вільню надзвычайны зьезд сваіх паўнамоцнікаў для прыняцьця новага статуту і пастаноў аб злучэньні.

4) Калі-б былі прыняты такія пастановы, зьезды пачынаюць працаваць супольна, як зьезд пачынаючага новага Агульнакраёвага Саюзу, каторы прыйме плян для бліжэйшай працы і абярэ ўлады Саюзу.

5) Па адкрыцьці Агульнакраёвага Саюзу ўсе істнуючыя ў краі Саюзы Спажывецкіх Таварыстваў павінны да яго ўступіць ці зьліквідавацца.

Пасьля гэтага канфэрэнцыя была зачынена.

✦ Чуць ня ўсе кааператывы горада Вільні атрымалі паперкі ад Кааператыўнага Інструктарыяту Дэпартамэнту Промыслу і Гандлю, каб яны зараз-жа прыслалі копіі статутаў і пратаколаў агульных сходаў за 1921 год. Яшчэ зразумела, калі вымагаюць копіі статутаў, але навошта спатрэбіліся гэтаму Дэпартамэнту ўсе пратаколы сходаў? Здаецца, закон вымагае ад кааператываў прысылаць статуты толькі пры рэгістрацыі, а пратаколы сходаў ніколі нігдзе ўлада не патрабавала.

✦ Прэзыдыум бышага ў Вільні Зьезда Краёвых Саюзаў у васобе паноў: Трэпкі і Вольскага разаслаў паперы, каб усе саюзы прыслалі сваіх прадстаўнікоў у камісію па апрацаваньню Агульнакраёвага Саюзу Кааператываў.

✦ Статут Віленскага Кааператыўнага Банку, апрацаваны Віленскім Саюзам Кааператываў, будзе на днях падпісаны. Ад імя Віленскага Саюзу Кааператываў падпішуць як закладчыкі банку: п. Бабінскі, п. Трэпка і п. Вітка. Да падпісаньня статуту будуць запрошаны: „Związek Kooperatyw Ziemi Wileńskiej", 2 прадстаўнікі ад гарадзкіх кааператываў і 4 ад сялянскіх кааператываў з розных паветаў Сярэдняй Літвы.

✦ Віленскі Саюз Кааператываў атрымаў на днях: 2 вагоны бульбы для гарадзкіх кааператываў, мыла для бялізны 300 пудоў і 17.000 кілё цукру. Цукер будуць раздаваць толькі сябрам якога-небудзь кааператыва, належачага да Віленскага Саюзу Кааператываў.

✦ Дэпартамэнт Аправізацыі атрымаў з Латвіі ў замен на карасін тры вагоны цукру. Глаўная Нафтавая Управа Польшчы (Główny Urząd Naftowy), як мы дачуліся, пратэстуе проціў бесспарадкавага абмену Сярэдняй Літвой з Латвіяй карасіну на цукер.

✦ У урадовых колах апошнія дні была думка зьліквідаваць Дэпартамэнт Аправізацыі і зрабіць пры Дэпартамэнце Промыслу і Гандлю аправізацыйны аддзел. Праект гэты, як мы чулі, не прайшоў. Дэпартамэнт Аправізацыі астаецца далей. Назначаны новы Дырэктар Дэпартамэнту аправізацыі з дужа вышэйшымі паўнамоцтвамі.

✦ Глаўны Польскі Статыстычны Камітэт зьвярнуўся ў Віленскі Саюз Кааператываў, каб ён узяў на сябе ўчасьце ў пярэпісі людзей, якая мае адбыцца на Крэсах. Управа Саюзу згодзілася.

✦ 3-га кастрычніка адбылося першае паседжаньне камісіі па злучэньню саюзаў кааператываў у вадзін Агульнакраёвы. Па настаяньню прадстаўніка „Związku Ziemi Wileńskiej" паседжаньне адкладзена на некалькі дзён.

ХРОНІКА.

Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прыслаўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць, і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

Львоўская ўкраінская газэта „Рідный Край" зьмясьціла ў № 217 такую заметку аб нас: „У Вільні пачаў выхадзіць тыднёвік, орган пасьвячоны вызваленчым справам Беларусі. Тыднёвік з пагляду палітычнага, літературнага і фармальнага прадстаўляецца дужа хораша, рэдактаваны і пісаны з душы і сэрца. месьціць у сабе паэзіі і партрэты найвызначнейшых беларускіх заслужоных людзей".

У тым-жа нумару „Рідного Краю" зьмешчан артыкул аб пятнаццатых угодках „Нашай Долі" і колькі розных вестак з беларускага жыцьця.

Аб Беларускім зьезьде ў Празе „Рідный Край" падае, між іншым, заметку: „28 верасьня распачаліся ў Празе беларускія канфэрэнцыі, скліканыя Нацыянальнай Сувязьзю, пры ўчасьці 40 прадстаўнікоў розных арганізацый з Беларусі і з-за кардону. Прадстаўлены ўсе беларускія палітычныя партыі. На канфэрэнцыях радзяцца аб унутраных справах і загранічнай палітыцы Беларусі".

Віленская паланафільская газэта на беларускай мове „Jednaść" аб зьезьде ў Празе піша: „Як паведамляе «Gazeta Warszawska», Беларускі зьезд у Празе Чэскай заняў варожае становішча да Польшчы і выразна прыхільнае да Літвы. Прадстаўнікі тых беларускіх груп, якія даводзілі недарэчнасьць такога становішча і паказвалі на сапраўдную дарогу ісьці побач з польскім народам, — былі пазбаўлены голасу„

Гэтая-ж газэта „Jednaść" піша:

„Як паведамляюць „Беларускія Ведамасьці", Дэпартамэнт Асьветы Сярэдняе Літвы заявіў Дырэкцыі 1 ай Беларускай Віленскай гімназіі, што гімназія будзе зачынена, калі ў апошніх, вышэйшых чатырох клясах, — навукі ня будуць выкладацца толькі на аднэй польскай мове.

Калі гэта праўда, дык гэта нешта страшнае. Мы думаем, што гэта — або нейкае непаразуменьне або выдумка".

Мы спадзяёмся, што „Jednaść", жывучы ў Вільні і цікавячыся беларускімі справамі, ужо пасьпела спраўдзіць: непаразуменьне ў гэтай справе ці „выдумка"? А зрабіўшы гэта, яна павінна выявіць свой запраўдны твар у „страшнай" навет для яе справе. Для ясьнасьці паказуем на неакуратнасьць „Jednaści" ў перадачы нашых вестак: Дэпартамэнт Асьветы ня думае зачыняць усю гімназію, а ставіць пытаньне толькі аб чатырох старэйшых клясах.

Паведамляем блізкія нам па духу беларускія газэты, што мы дасталі з Амерыкі такое пісьмо:

„Slaviansky Klub 543 East 11 St. New. York, N. Y. America.

Mon. Sept. 19, 1921. Шаноўны Рэдактар! Я, арганізатар Славянскага Клюбу і бібліатэкі-чытальні пры ім, дзеля вялікай папулярнасьці маёй бібліатэкі і вялікаму % беларусаў, прашу высылаць Вашу газэту ў наш клюб-чытальню. Прашу паставіць мяне контр-агентам Вашай газэты ў Амэрыцы і высылаць мне па 25 экзэмпляраў, на месяц 100. Кожныя тры месяцы я буду высылаць Вам аванс за газэту ў далярах альбо польскіх марках. Гатовы да помачы — пашырэньня Вашае газэты між беларусаў ў Амерыцы Ваш

Аляксандар Козак."

Аўтор «Гісторыі Беларускае Літэратуры» Максім Гарэцкі прадаў вядомаму віленскаму выдаўцу Барысу Клецкіну права на выданьне гэтае кнігі ў працягу трох гадоў. За некалькі дзён кніга зьявіцца ў новым выданьні.

✦ Як кажуць, ангельцы зрабілі з Польшчай канцэссію на вырубку усей Белавежскай пушчы. Англія кожны год будзе плаціць Польшчы 15.000.000 фунтаў штэрлінгаў, а гэта на польскія маркі будзе некалькі міліярдаў.

✦ Выйшоў № 6 А часопісі „Kooperacji" выдавецтва Віленскага Саюзу Кааператываў. Прадаецца ваўсіх кааператывах. Зьмест номера багаты.

✦ 1 кастрычніка у Паставах, Дунілавіцкага павету, былі вось якія цэны на прадукты: жыта 2000-2200 мар., ячмень 1800, авёс 1600-1700, бульба 350-400, сьвініна 300-320, масла 600, яйкі 15-17 мар.

✦ 5 кастрычніка у Багданоўскім раёні Валожінскага павету былі вось якія цэны: жыта 1600-1800, пшаніца 2300- бульба 350-400, мёд пчаліны 350 400, семя альнянoе 2200-2400, цыбуля 1100-1200, гарох 1800, сьвініна 200-210, яблыкі зімовыя 2500-3000, масла 500-560, яйкі 18-20, малако 35 40, сыры 100-150, капуста 800.

✦ Віленскі Саюз Кааператываў атрымаў новых тавараў на 18 мілёнаў марок: цукер, мыла, падэшвы, серчыкі, саганы, скавароды, соль. Тавары раздаюцца толькі таварыствам, уваходзячым у Віленскі Саюз Кааператываў.

✦ Дэпартамэнт Аправізацыі, ужо атрымаўшы тры вагоны цукру з Латвіі у замен на нафту, хочаць і далей рабіць такі замен, але 15 вагонаў, ужо нагружаных нафтаю, затрыманы па распараджэньню з Варшавы, якая не згаджаецца на такі таваразамен. Цікава, чым гэта непаразуменьне паміж Вільняй і Варшавай вырашыцца.

✦ Збор на вуліцах Вільні 25 верасьня г. г. на карысьць бедных дзетак-беларусаў перавысіў 150 тысяч польскіх марак. Кіраўніцтва зборам выказуець сваю шчырую падзяку усім, ахвяраваўшым сваю працу на зьбіраньне, а таксама паважанаму грамадзіну Знамяроўскаму, споўніўшаму дарма ўсю друкарскую работу.

Урад.

✦ Віленскі Саюз Кааператываў маніцца праз 2-3 тыдні арганізаваць тыднёвыя кааператыўныя курсы. Курсы маюць мэтаю даць сьвядомых у кааперацыі грамадзян. Прымаюцца на гэтыя курсы ўсе ўмеючыя чытаць і пісаць. На курсах будуць тэорэтычныя занятки 8 гадзін у дзень.

Адначасна праектуецца пяцьмесячная курсы, якія будуць выпушчаць кааператыўных інструктароў. („Беларускі Звон").

✦ Гарадзкое Старэства падало да агульнага ведама, што з 1 гэтага кастрычніка адмяняецца прымусовае шчапляньне халеры для тых, хто едзе чугункаю, а таксама ня будзе з таго самага дня й кантролю пасажыраў на вакзале ў Вільні.

✦ „Беларус" у сваім часе, а цяпер „паляк" бугальтэр Дэпартамэнту Аправізацыі п. Вільгельм Ражноўскі пасварыўся з быўшым Дырэктарам Дэпартамэнта Аправізацыі беларусам Вацлавам Іваноўскім. Быўшы „беларус" Ражноўскі цяпер выслужываецца тым, што накідываецца на прадстаўнікоў розных установ, якія маюць адвагу лічыць сябе беларусамі.

✦ Ня так даўно у Дэпартамэнт Аправізацыі былі запрошаны прадстаўнікі ўсіх кааператыўных Саюзаў і між іншым „Краёвая Сувязь" пана Аляксюка. На паседжаньне зьявіўся ад яе новы „кааператар" п. Вярнікоўскі. Кааператыўныя установы, у асобе п. Турскага запратэставалі супроць сяброўства з Сувязьзю; і Дырэктар Дэпартамэнту п. Нямчыновіч, растлумачыў п. Вярнікоўскаму, што ён быў запрошаны... „памылкова".

✦ Па новаму дэкрэту уніяцкія дамы, апроч сьвятынь, пераходзяць на ўласнасьць скарбу Сярэдняе Літвы. Але ў дэкрэце няясна сказана, ці падпадаюць пад яго, прыкладам, муры Сьвята-Троіцкага манастыра, быўшыя спачатку у руках праваслаўных, потым уніятаў, потым ізноў праваслаўных. Тымчасам, праваслаўнаму архірэю Елеўферыю, як кажуць, прыслана ўжо нейкая папера, што муры Сьвята-Троіцкага манастыра таксама пераходзяць на ўласнасьць скарбу?! Мабыць, гэта нейкая памылка ніжэйшых спаўніцеляў закону, стаячая між іншым у поўнай супярэчнасьці з пеўнымі словамі аб мурох самаго ген. Жэлігоўскага. Пажывём-пабачым, прыдзецца папрацаваць беларускім юрыстам у гэтай справе, ці не...

Вядомы слаўны зьбіральнік народных песьняў Антон Грыневіч, адседзіўшы 9 месяцаў у вастрозе, наднях выпушчаны на волю. Усё віленскае беларускае грамадзянства вельмі усьцешана, што стары дзеяч, слабы на здароўе, не загінуў.

Надоячы ў аднаго з віднейшых віленскіх беларускіх дзеячаў Антона Луцкевіча быў карэспандэнт газэты „Czas", які між іншым спытаўся, ці прымуць беларусы учасьце ў задуманным скліканьні Сойма Сярэдняе Літвы? На гэта Антон Луцкевіч адказаў, што на яго зданьне, калі істнуючыя адносіны да беларусаў ня зьменяцца карэнным чынам, то беларусы, бязумоўна, ад выбараў у Сойм адмовяцца.

А, Луцкевіч разам з гісторыкам п. Краскоўскім парадкуець цяпер багатую нацыянальную беларускую бібліатэку, якую зьбіраў усё сваё жыцьцё нябожчык Іван Луцкевіч і перад сьмерцю адказаў беларускаму грамадзянству. Бібліатэка неўзабаве будзе адчынена для карыстаньня з навуковымі мэтамі,

Як ведама, цяпер у Вільні. апроч „Литовскихъ Епархіальныхъ Вѣдомостей", няма ніводнай расейскай газэты, Нас паведамляюць, што посьле нязвычайна даўгіх стараньняў тутэйшыя расейскія журналісты дасталі дазвол на штодзенную газэту „Виленское Утро", якая ў бліжэйшых днях мае паказацца.

✦ Пытаньне аб чатырох старэйшых клясах 1-й Віленскай Беларускай Гімназіі дагэтуль застаецца адчыненым. Бацькі вучняў, педагогі Гімназі, Т-ва Белаларускае Школы і уся беларуская прэса згодна і цьвёрда стаяць на сваім пункце, што гэтыя клясы ні ў якім разе ня могуць быць пераведзены з выкладовай беларускай мовы на польскую, закрыцьце-ж іх за адмову перайсьці на польскую мову зьявіцца вячуванай крыўдай беларускаму грамадзянству. Пара-другая масквафілаў, у зьвязку з няпеўным становішчам Гімназіі, ужо ўзялі з яе сваіх дзяцей і аддалі ў Праваслаўную Літоўскую Сэмінарыю і ў Праваслаўную Жаноцкую Гімназію п. Пасьпелавай. У польскія гімназіі не перайшоў ні адзін вучэнь. Грошы вучыцялём малодшых клясаў 1-й Віл. Белар. Гімназі за жнівень і верасень Дэпартамэнт Асьветы надоячы выплаціў, але з абніжаным множнікам.

✦ Гэтымі днямі распачаліся заняткі ў Віленскай Праваслаўнай Жаноцкай Гімназіі п. Пасьпелавай (з расейскай выкладовай мовою).

✦ Дзеля таго, што Беларуская Вучыцельская Сэмінарыя ў м. Барунах Ашмянскага павету зачынена, яе быўшыя вучні ў значнам ліку паступаюць ў 1-ю Віленскую Беларускую Гімназію. Бацькі зьмяшчаюць дзяцей ў інтэрнаце пры Гімназіі, прывозячы для іх прадукты з сваіх вёсак.

✦ Уступілі запраўднымі сябрамі ў „Тва Беларускае школы" 63. Зяновіч Пётра, 64. Зяновічыха Марыя, 65. Пушкарчук Аляксандар, 66. Іванкевіч Міхал, 67. Габрыновіч Язэп, 68 Міцька Міхал, 69. Хведаровічанка Марыя, 70. Жабіншчынка Ганна, 71 Гайка Аляксандар, 72. Гайка Вольга, 73. Верамей Мікола, 74. Жукоўскі Аляксей, 75. Вішнеўскі Янка, 76. Станкевіч Міхал Язэпаў, 77. Барада Хвадзей, 78 Семяняка Уладзімер і 79, Лотыш Янка.

Папраўка. У № 4 „Бел. Вед." у карэспандэнцыі „Стары чарнасоценец" з недагляду карэктара сталася абмылка. Заместа „Гарадзешня" ўсюды павінна быць „Гародзькі".

Украінскае жыцьце.

У палавіне кастрычніка ў Празе Чэскай адчыняецца ўкраінскі універсытэт з філасофскім і праўным аддзеламі. Універсытэт той посьле будзе перанесены у Львоў (Е.Е).

У Заходняй Галіцыі арыштована шмат камуністаў за прапаганду. („Вперед!")

Львоўская дырэкцыя паліцыі зачыніла украінскі тыднёвік „Бацькаўшчыну".

„Канадійськый Ранок" паведамляе, што неўзабаве выйдзе з друку збор твораў Тараса Шэўчэнка на ангельскай мове. (Украінськый Голос")

Літоўскае жыцьце.

Надоячы Дырэктар Дэпартамэнту Унутраных Спраў Сярэдняе Літвы п. Сенкевіч налажыў 100 тысяч марак штрафу на рэдактара газэты „Wilnius" п. М. Біржышку. „Vilnius"

Уладаа зачыніла Віленскі Літоўскі Банк. Дадзен кароткі час на расплату здаўжнікамі і для ліквідацыі

Віленскаму кааператыву „Ляймэ" Дэпартамэнт Унутраных Справаў адказаў, што прадстаўлены на рэгістрацыю статут таварыства ім не рэгіструецца. Статут быў пасланы ў літоўскай мове.

1 га кастрычніка пасьля паўдня паліцыя абкружыла будынак Літоўскай Гімназіі ў Вільні з мэтай высяленьня з яго Гімназіі і Вышэйшых Літоўскіх Педагогічных курсаў. Заданьне дакан[illegible] з падмогай нейкіх суб'ектаў так, што аказаліся пабітыя і акрываўленыя дзеці (па „Vilnius"-у).

З 2 на 3 кастрычніка было гаарыштована колькі ліцьвіноў на вул. Субач 16. Літоўскі прытулак, які тут зьмяшчаўся, выселен (па „Vilnius"—у).

Літоўскія школы, выселеныя з сваіх ранейшых будынкаў, ніяк ня могуць знайці патрэбных памяшчэньняў. Адзін добра рэмантаваны ліцьвінамі пад школу прыватны дом зрэквізован пад нейкую чыгуначную ўстанову.

Да 1000 чалавек вучнёўскай літоўскай моладзі ў Вільні цяпер з гэтых прычын ня вучацца. (па „Vilnius"—у).

У літоўскіх сялібах у Маркуцьці (пад Вільняю) доўга шукана ў зямлі нібы-та схаванага там аружжа, але нічога ня знойдзена.

Курс на грошы ў Вільні.

8 кастрычніка 1921 г.

	мар.
Нямецкія маркі (1000)	48
Ост-маркі (1000)	45
Фунты	20.300
Даляры	5800
Золата рублі (100)	235.000

Да сябраў гарадзкіх кааператываў.

Дзеля блізкага надходу зімы і ў зьвязку з гэтым уздаражэньня сялянска-гаспадарскіх прадуктаў ніжэйпадпісаныя кааператывы, становячыся на абарону інтарэсаў сваіх сяброў—гарадзкіх спажыўцоў, на супольным паседжаньні, прышлі да аднадушнага выватду, што толькі шлях неадложнай куплі (праз Віленскі Саюз Кааператываў) прадуктаў сялянскай гаспадаркі (бульбы, цыбулі, морквы, буракоў і г. д.) самымі сябрамі кааператываў на сабраныя сярод іх-жа грошы можаць вывесьці спажыўца з магучага здарыцца цяжкога становішча у будучую зіму. Для выкананьня намечаных загатовак патрэбны грошы, якія павінны быць дадзены сябрамі сваім кааператывам у відзе авансаў у ліку 5.000 марак ад кожнага сябры таварыства.

Прадукты будуць выдавацца толькі сябрам, ўнёсшым авансы.

Дзеля таго, што агародніна павінна быць куплена зараз-жа і яшчэ да надходу марозаў, — авансы трэба ўнясьці як найхутчэй.

Авансы ўносяцца вось у якія кааператывы:

„Работнік", Нямецкая 22 (і у адзеле на Ніжагародзкай вул.).

„Тружанік", Вялікая 96.

„Асвабаджэньне", Троцкая 3.

„Лаймэ", Св.-Янская 23.

„Эканомія", Вул. Трэцьцяга Мая № 1 (быўш. Казанская).

„Дарбінінкас", Завальная 16 (і ў аддзелах.

„Рамесьленікаў ізраэліцкіх", Віленская 8.

„Будучае" („Пшышлосьць"), Віленская 10.

„Коопэрацыя", Віленская 12.

„Райніца", Вялікая Пагулянка 17 (і ў аддзеле на Сіроцкай).

„Таварыш", Юраўскі 31.

8 кастрычніка 1921 г.
Вільня.

Рэдактар-Выдавец: Максім Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК" Субач 2.